## РТ-2024/2025 гг. Этап I Варыянт 1

А1. Адзначце словы, якія маюць лексічнае значэнне ‘які рашуча дабіваецца сваёй мэты’:
1) наступны;
2) даверлівы;
3) дабрадушны;
4) напорысты;
5) настойлівы.

А2. Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць з вялікай літары:
1) птушка (С/с)ініца;
2) вёска (В/в)язынка;
3) малады (І/і)нжынер;
4) дрэва (Л/л)іпа;
5) часопіс «(П/п)олымя».

А3. Адзначце словы (прыклады) з правільным напісаннем падкрэсленых літар:
1) парадна-урачысты;
2) вакуўм;
3) Марына Уладзіміраўна;
4) жаўток;
5) саунa.

А4. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) раз’езд;
2) мышь;
3) агенчык;
4) павільён;
5) пьедэстал.

А5. Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (паў) ананаса;
2) (Доўнар) Запольскі;
3) (дуб) волат;
4) (вела) спорт;
5) (кава) варка.

А6. Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:
1) (чырвана) дзюбы;
2) (горка) салёны;
3) (вода) праводны;
4) (архітэктурна) мастацкі;
5) (абсалютна) выпадковы.

А7. Адзначце прыклады, у якіх не з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:
1) (не) запомніўшы адраса;
2) (не) напаленая мной печ;
3) (не) высокі, а нізкі голас;
4) (не) як сустрэліся;
5) (не) пахісная вера.

А8. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:
1) за два кіламетры ад горада;
2) старэйшы сястры;
3) дзякаваць настаўніка;
4) смяяцца з няўмекі;
5) ісці праз лес.

А9. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску абавязкова ставіцца працяжнік:
1) Зайцу ліса _не сяброўка.
2) Больш за ўсе кветкі люблю пралескі: яны _ прадвесніцы вясны.
3) Даўжыня экалагічнай сцежкі ў Бярэзінскім запаведніку _ тры кіламетры.
4) Гуляць па вераснёўскім лесе _ сапраўдная асалода.
5) Палессе _ скарбніца старажытнай і самабытнай сялянскай культуры.

А10. Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Цаню ў людзях шчырасць, дабрыню, і ветлівасць, і працавітасць.
2) Паэма «Новая зямля» дапамагае нам не толькі ўбачыць сялянскае жыццё, але і зразумець яго мудрасць.
3) Мяжы, ці ўзросту навука не мае.
4) З чырвоных, ды жоўтых лістоў зноў тчэцца навокал асенняе покрыва.
5) Люблю на беразе азёрным у ціхі, летні вечар пастаяць.

А11. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):
1) Часам воблакі збіраюцца ў чароды _ быццам птушкі _і па небе павольна плывуць.
2) Ва ўсе куткі _нібы пісьманосец _ разносіць восень жоўтыя лісты.
3) Нашы бары _ што палацы.
4) Пятра Клімука мы шануем _ як першага беларускага касманаўта і вялікага вучонага.
5) Зырка _ нібыта зоры _ зіхацяць беларускія азёры.

А12. Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Дарыў вяскоўцам салавейка вечарком, сатканыя са звону срэбных струн, песні.
2) Пералёт, ці інакш міграцыя, птушак і сёння застаецца шмат у чым загадкавай з’явай.
3) На Купалле, апрача кветак, мы з бабуляй збіралі зёлкі.
4) Рассыпаўшы зорны авёс, выплыў маладзік на ліловую пашу нябёс.
5) Свой парадак у садах май наводзіць, не спяшаючыся.

А13. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):
1) Кожны чалавек _ мяркую _ абавязкова павінен быць камусьці патрэбным.
2) Хлусня ёсць розная, а праўда _ на тое ж яна і праўда! _ толькі адна.
3) Корань навукі горкі, аднак _ плады яе салодкія.
4) Амаль _ у кожным жарце ёсць доля праўды.
5) Духоўныя скарбы _ трэба прызнацца _ самыя дарагія.

А14. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:
1) Зачапіўся ветрык за галінку _ і расы як не было.
2) То дзяцел зімовую цішыню парушыць _ то сарока-трашчотка ўскалыхне сцюдзёнае паветра.
3) Усё часцей мне сніцца дзядулева хата на хутары _ і ўспамінаецца дворык ля хаты, вішнямі ўхутаны.
4) У лесе было ціха, глуха _ затое ў полі выла злая завіруха.
5) Лес усё чуе _ а поле ўсё бачыць.

15. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:
1) Шчыглоў часта можна ўбачыць у зарасніках чартапалоху, бо харчуюцца гэтыя птушкі насеннем пустазелля.
2) Зразумела, што, калі духоўны свет чалавека багаты, то багатай будзе і яго мова.
3) Мецэнатам называюць чалавека, які неабыякавы да мастацтваў і навук і які фінансава падтрымлівае іх развіццё.
4) Каб падсініць хмар касынкі пушыстыя, сінькі ўвысь сыпанула вясна.
5) Зарастаюць тыя дарогі па якіх не ходзяць.

16. Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказаў не пастаўлены): **[ ]: [ ].**
1) Зайшоўшы ў лес, заўважаю павукі між гонкіх соснаў снуюць тоненькія кросны.
2) Ёсць розум будзе толк.
3) Штовечар нездарма хаджу я да нашага слаўнага возера ў яго ваду жывую з неба зоры глядзяць-любуюцца.
4) Дождж перастаў чароўная вясёлка дугой павісла над зямлёй.
5) Дабрыня чалавека чуецца ў яго голасе дабрыня чалавека бачыцца ў яго позірку.

А17. Адзначце нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з markрознымі відамі сувязі частак трэба паставіць коску:
1) Стаю на беразе Прыпяці і не магу надзівіцца з яе 1) _ як толькі разгуляўся вецер 2) _ Прыпяць нахмурылася, голасна ўсхліпнула ды пачала шпурляць, выкідваць на бераг пенныя хвалі, але праз колькі хвілін 3)_ калі вецер супакоіўся 4)_ і калі над Палессем рассыпалася мільярдамі залатых крупак сонечнае святло 5)_ зноў утульна разлеглася лагодная рака ў сваіх мяккіх берагах.

А18. Адзначце сцверджанні, якія адпавядаюць сказу з простай мовай:
*«Старажытныя рымляне шчаслівыя дні адзначалі белымі каменьчыкамі» прыгадаў пачутае сябар.*
1) у сказе адсутнічае двукроп’е;
2) у сказе адсутнічае кропка;
3) у сказе адсутнічае коска;
4) у сказе адсутнічае працяжнік;
5) простая мова няправільна заключана ў двукоссе.

В1. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*лідэр, почырк, доўгачаканы, рэцэпт, сагравація.*

В2. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*гразелячэбніца, легенда, месец, мядовы, безасабовы.*

В3. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*бярозка, людскі, капусны, выкладчык, баскедбол.*

В4. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:
*рассмяшыць, прaграма, жыццё, паднябесье, сугучча.*

В5. Запішыце лік 18 словам.

В6. З выдзеленых у прыкладах слоў вызначце прыслоўе, якое пішацца разам. Раскрыйце дужкі і запішыце гэта прыслоўе:

*(па) вясенняму сонечна, час (ад) часу палівыць, адсыпаць (на) вока, падарожнічаць (у) адзіночку, (за) летась пабудавалі.*

В7. З дзвюх часціц, пададзеных у дужках, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў прапанаваным сказе. Запішыце гэту часціцу:

*Не магу (ні, не) пагадзіцца з думкай, што той, хто ўпершыню назваў вярбу плакучай, меў душу паэта.*

В8. Выпішыце граматычную аснову наступнага сказа:

*Працавітага чалавека, паверце, усюды паважаюць.*

В9. Вызначце, якія гукі абазначаюць падкрэсленыя ў словах літары, і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Ра<u>**с**</u>чарціць. | **1.** [**с**]. |
| **Б.** Ка<u>**с**</u>мічны. | **2.** [**з**]. |
| **В.** Про<u>**с**</u>ьба. | **3.** [**с'**]. |
| **Г.** Маро<u>**з**</u>. | **4.** [**з'**]. |
| | **5.** [**ш**]. |

В10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Выбар. | **1.** Словаскладанне. |
| **Б.** Назаўтра. | **2.** Абрэвіяцыя. |
| **В.** БДУ. | **3.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны). |
| **Г.** Узнавіць. | **4.** Прыставачны. |
| | **5.** Прыставачна-суфіксальны. |

В11. Да слоў-кампанентаў, прапанаваных у левым слупку табліцы, падбярыце словы-кампаненты з правага слупка, каб узнавіць фразеалагізмы. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** .. за вярсту. | **1.** Абыходзіць |
| **Б.** .. ад рук. | **2.** Лезці |
| **В.** .. вочы. | **3.** Браць |
| **Г.** .. зморам. | **4.** Адвесці |
| | **5.** Адбіцца |

**Тэкст да заданняў В12-В22**

(1) Слова (словазлучэнне або спалучэнне слоў), што служыць для абазначэння асобы ці прадмета, да якога звяртаюцца, называецца зваротскам.

(2) Зваротак не можа існаваць без сэнсавай сувязі са сказам або з членамі сказа. (3) Сувязь у большасці выпадкаў паказваецца пры дапамозе інтанацыі: Зіхаціш ты, родны **горад**, сонейкам асветлены вясновым. (4) У ролі зваротка звычайна **выступаюць** назоўнікі або субстантываваныя часціны мовы. (5) Напрыклад: Ззяйце, крынічкі, на зямлі беларускай **срэбрам** самай высокай пробы! Хачу **пажадаць** вам, родныя, здароўя на доўгія гады! (6) У вуснай мове, у мастацкай літаратуры пры перадачы маўлення дзеючых асоб ужываюцца звароткі, выражаныя назоўнікамі клічнай формы: Вяртайся, дружа, дадому хутчэй! (7) Часам у ролі зваротка выступаюць займеннікі. (8**) Займеннікі** ў гэтым выпадку маюць форму 2-й асобы адзіночнага **або** множнага ліку. (9) Яны часта суправаджаюцца выклічнікамі: Гэй, вы! Шчаслівымі расціце, маладыя юнакі! (10) У пачатку сказа зваротак аддзяляецца **коскай**: Сынок, не забывай, што моцны не той, хто стрымлівае коней, а той, хто стрымлівае сабе. (11) Пасля зваротка, які вымаўляецца з моцным пачуццём, ставіцца клічнік. (12) Пры наяўнасці клічніка слова, што ідзе адразу пасля зваротка, пішацца з вялікай літары: Матуля мая любая! Ты на ўсё (адказваць) дабрынёй. (13) Выдзяляюць коскамі зваротак, што стаіць у сярэдзіне сказа: У лёгкім

вальсе закружы, ціхі ветрык, лісце залатое! (14) Зваротак, які знаходзіцца ў канцы сказа, аддзяляюць коскай. (15) Пасля яго ставіцца знак, які абумоўлены сэнсам і інтанацыяй сказа: Як сумна сёння, у вырай сабраўшыся, вы пракрычалі (нада, над) мною, жураўлі!

B12. Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:
1) тэкст мастацкага стылю;
2) тэкст публіцыстычнага стылю;
3) тэкст навуковага стылю;
4) тэкст гутарковага стылю;
5) тэкст афіцыйнага стылю.

B13. З двух слоў, выдзеленых у 8-м сказе тэксту, вызначце тое, якое з'яўляецца сродкам сувязі 7-га і 8-га сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў 8-м сказе.

B14. Знайдзіце ў 9-м сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў 9-м сказе.

B15. Запішыце выдзелены ў 10-м сказе тэксту назоўнік у форме давальнага склону адзіночнага ліку.

B16. Ад назоўніка, выдзеленага ў 3-м сказе тэксту, утварыце пры дапамозе суфікса -ск- прыметнік. Запішыце гэты прыметнік у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.

B17. Знайдзіце ў 10-м сказе тэксту слова, якое мае няправільную граматычную форму. Запішыце гэта слова ў патрэбнай граматы
B18. Запішыце прапанаваны ў дужках у 12-м сказе тэксту дзеяслоў у форме абвеснага ладу прошлага часу адзіночнага ліку жаночага роду.

B19. Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў 4-м сказе тэксту, утварыце дзеепрыслоўе і запішыце

B20. З двух прыназоўнікаў, прапанаваных у дужках у 15-м сказе тэксту, вызначце той, які павінен быць ужыты ў дадзеным сказе. Запішыце гэты прыназоўнік.

B21. З двух слоў, выдзеленых у 5-м сказе тэксту, вызначце тое, якое не мае суфікса. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў 5-м сказе.

B22. Вызначце ў 14-м сказе тэксту слова, якое з'яўляецца дзейнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў 14-м сказе.